Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(79), 2013

*УДК 94:357(476+474.5)“17”*

# Кавалерыя арміі Вялікага княства Літоўскага XVIII ст.: эвалюцыя структуры

С.А. ЧАРОПКА

У артыкуле даследуецца працэс эвалюцыі кавалерыйскіх падраздзяленняў арміі ВКЛ падчас фарміравання рэгулярнай арміі гэтай краіны ў XVIII ст. Вывучаецца структура кавалерыі ў разрэзе ваенных рэформ, арганізацыя яе асобных відаў, адраджэнне літоўскай кавалерыі ў 1812 г.
**Ключавыя словы:** армія ВКЛ, гусары, пяцігорцы, казакі, уланы, драгуны, нацыянальная кавалерыя, пярэдняя варта.

This article explores the process of regeneration of the army cavalry of the Great Duchy of Lithuania during the formation of regular army of the country in the 18th century. The cavalry structure in a cut of military reforms, the organization of its special kinds, revival of the Lithuanian cavalry in 1812 are studied in the article.
**Keywords:** army of Great Duchy of Lithuania, hussars, five-mountaineers, cossacks, uhlans, dragoons, a national cavalry, forward guards.

Армія заўсёды была і з’яўляецца зараз важным элементам дзяржаўнай структуры, што забяспечвае суверэнітэт і незалежнасць ад іншых гаспадарстваў, якія вельмі часта імкнуцца тым або іншым чынам умяшацца ва ўнутраныя справы суседзяў. Нашым продкам на розных этапах развіцця беларускай дзяржаўнасці, ад часоў Полацкага княства да XX ст., не раз даводзілася са зброяй у руках абараняць сваю зямлю. Таму Беларусь мае багатыя вайсковыя традыцыі і вялікую колькасць ваяроў, жыццё і дзейнасць якіх дзеля дабра сваёй Айчыны могуць быць годным прыкладам для сучаснікаў і нашых нашчадкаў. Мы добра ведаем імёны сыноў беларускай зямлі, якія сваёй ахвярнасцю ўнеслі значны ўклад у выбаўленні свету ад “карычневай чумы” ў сярэдзіне XX ст., шануем нашых сучаснікаў, якія змагаліся ў лакальных канфліктах, але, на жаль, практычна не ведаем аб развіцці айчыннай вайсковасці ў часы Рэчы Паспалітай.

Гэты прабел шмат у чым звязаны з гістарычнымі рэаліямі, якія існавалі на момант зараджэння і фарміравання беларускай гістарыяграфіі. Айчынныя навукоўцы ў савецкія часы не мелі магчымасці стварыць трывалы падмурак у вывучэнні беларускай вайсковасці XVIII ст., толькі з набыццём незалежнасці і станаўленнем уласнай дзяржавы з’явіліся першыя даследаванні [1]–[4]. Значна большую ўвагу названай праблеме ўдзялілі польскія гісторыкі, якія, даследуючы гісторыю кароннага войска, так або інакш закранаЛі пытанні, звязаныя з арміяй ВКЛ [5]–[10]. У наш час існуе магчымасць выкарыстаць раней цяжкадаступныя гістарычныя крыніцы і на іх аснове даследаваць гэтую тэму. Такім чынам, тэма гісторыі айчыннай вайсковасці падаецца даволі актуальнай як з навуковага, так і грамадскага пункту гледжання. У сувязі з маштабнасцю тэмы ўсе яе аспеты разгледзіць у адным артыкуле падаецца немагчымым, таму мы прыпынемся толькі на пытанні эвалюцыі кавалерыі рэгулярнай арміі ВКЛ у XVIII ст. і на пачатку XIX ст.

Актыўная знешняя палітыка Расійскай дзяржавы ў другой палове XVII–XVIII ст. у спалучэнні з усё большым аслабленнем дзяржаўнай улады ў Рэчы Паспалітай прывяла да сур’ёзных змен у геапалітычным становішчы ва Ўсходняй Еўропе і канкрэтна нашай Бацькаўшчыны, якая на той час была складовай часткай польска-літоўскай федэрацыі. Дзеля выхаду краіны з глыбачайшага крызісу трэба было тэрмінова рэфармаваць палітычную, эканамічную і сацыяльную структуры, у тым ліку і сістэму абароны дзяржавы. Але спробы караля Аўгуста II Моцнага ўзмацніць уладу кіраўніка дзяржавы выклікалі рэзка негатыўную рэакцыю з боку апазіцыйна настроенай кансерватыўнай магнатэрыі і расійскага кіраўніцтва, якое, зыходзячы са знешнепалітычных інтарэсаў сваёй дзяржавы, лічыла немэтазгодным уз-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

мацненне Рэчы Паспалітай. У выніку ў 1717 г. на “Нямым” сойму апазіцыйная магнатэрыя пры падтрымцы Расіі здолела прымусіць Аўгуста II адмовіцца ад рэформ, але нейкія зрухі, тым не менш, адбыліся.

На сойму 1717 г., акрамя іншага, фактычна было прынята рашэнне аб правядзенні ваеннай рэформы, якая прадуглежвала сур’ёзныя змены ў арганізацыі ўзброеных сіл Рэчы Паспалітай, у прыватнасці, стварэнне рэгулярнай арміі. Літоўскія войскі павінны былі налічваць 6 тыс. жаўнераў, каронныя – 18 тыс. [11, с. 256]. Зважаючы на ўзровень мілітарызацыі суседніх дзяржаў, напрыклад Францыі, Аўстрыі, Расіі, арміі якіх у мірны час налічвалі па 100 тыс., Прусіі – 40 тыс. жаўнераў, Саксоніі – 30 тыс. чал., армія Рэчы Паспалітай выглядала як дэкаратыўны элемент, але яе стварэнне ўсё ж стала крокам наперад у рэфармаванні ваеннай справы краіны [12, с. 141], [13, с. 8, 10], [14, с. 301].

У кавалерыі ВКЛ ствараліся 6 гусарскіх харугваў агульнай колькасцю 400 коней, 25 харугваў больш лёгкай кавалерыі – пяцігорцаў, якія налічвалі 1160 коней, 12 татарскіх харугваў, колькасцю 460 коней, 8 казацкіх харугваў колькасцю 240 коней і 4 драгунскіх палка агульнай колькасцю 1500 коней [15, с. 19]. З мэтай прадухілення злоўжыванняў камандзірскага складу і кантроля за станам войска была ўтворана пасада генеральнага інспектара кавалерыі.

Тактычнай адзінкай кавалерыйскіх падраздзяленняў у арміі ВКЛ з’яўлялася харугва. Гусарскія харугвы ў сярэднім павінны былі налічваць па 55 коней, харугвы пяцігорцаў і лёгкай кавалерыі налічвалі па 50 коней, аднак ў рэальнасці гэтыя лічбы выглядалі інакш [16, с. 168–173]. Татарскія і казацкія харугвы налічвалі звычайна па 30–40 коней [17, с. 190–192]. На чале харугвы стаялі ратмістр, паручнік і харунжы, ролю падафіцэраў адыгрывалі таварышы. Харугвы аб’ядноўваліся ў палкі, сярод якіх найбольш баяздольным быў рэгімент гвардыі коннай ВКЛ. Камплектацыя конных падраздяленняў ажыццяўлялася шляхам вярбоўкі таварышоў з іх поштамі, якія налічвалі 1–2 паштовых.

Гвардзейская кавалерыя мела сваю форму, якая складалася з чырвонага мундзіра, светла-гранатавых камізэлькі і штаноў [15, с. 20]. Палявыя кавалерыйскія харугвы, у адрозненні ад драгунскіх падраздзяленняў, доўгі час не мелі ўніформы, толькі ў 1746 г. быў уведзены адзіны строй для асобных відаў кавалерыі. Знакам адрознення афіцэра ў кавалерыі выступаў срэбранага колеру шалік.

Улічваючы важную ролю коннай пяхоты ў войнах XVII ст., прадугледжваўся набор 1500 драгунаў, з якіх стварылі 4 рэгіменты (палкі) – лейб-рэгімент драгунаў каралеўскіх ВКЛ і 3 палявыя палкі. Гвардзейскі драгунскі рэгімент налічваў 587 жаўнераў і складаўся са штаба і 8 кампаній (рот) [18, с. 21]. Палявы драгунскі рэгіміент налічваў 341 жаўнера і складаўся са штаба і 6 кампаній.

Нягледзячы на ўсе недахопы, ваенная рэформа, якая была распачата на “Нямым” сойме 1717 г., стала важным крокам на шляху да стварэння паўнавартаснай арміі. Утварэнне пастаяннага штату, вызначэнне канкрэтных шляхоў фінансавання войска, стварэнне струкурнай арганізацыі драгуніі садзейнічалі паступоваму знішчэнню архаічных рыс у сістэме дзяржаўнай абароны. Аднак палавінчатасць рэформ патрабавала правядзення далейшых мерапрыемстваў, чаго, аднак, не адбылося, у выніку чаго як каронная армія, так і армія ВКЛ не здолелі выйсці на канкурэнтназдольны ўзровень з войскамі суседніх дзяржаў і не маглі паўнавартасна выконваць свае функцыі.

Новая спроба рэформ звязана з прыходам да ўлады Станіслава Панятоўскага. Ужо на канвакацыйным сойму 7 мая 1764 г. было прынята рашэнне аб стварэнні “Камісіі вайсковай”, якая мусіла стаць каталізатарам рэформ у арміі [19, с. 39, 83]. На каранацыйным сойму 3 снежня 1764 г. было абвешчана аб стварэнні Вайсковай камісіі ВКЛ, месцам пастаяннага размяшчэння якой стала Гародня [20, с. 170].

Камісія здолела зрабіць шмат для дасягнення сваёй мэты: “…усталявала парадак у арганізацыі, павысіла аслабленую субардынацыю і дысцыпліну, павысіла ўзровень адукацыі ў вышэйшых вайсковых і, у рэшце рэшт, стварыла армію, якая не саступала аніводнай тагачаснай еўрапейскай…” [15, с. 20]. Аднак сумныя ўнутрыпалітычныя падзеі 1767–1772 гг. у сукупнасці з агрэсіяй суседніх дзяржаў тэрмінова патрабавалі новых рэформ.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Ваенная рэформа стала адным з асноўных пытанняў на сойме 1773–1775 г., на пасяджэннях якога было вырашана павялічыць армію ВКЛ да 8 тыс. чалавек. Найвышэйшая ўлада была перададзена Вайсковаму дэпартаменту, дзе рашэнні прымаліся калегіяльна, а гетманы былі толькі сябрамі гэтага органа. Прадугледжваліся сур'ёзныя структурныя змены. Армія ВКЛ падзялялася на 2 дывізіі [21, с. 351–352]. Замест ранейшага падзелу кавалерыі на гусараў, пяцігорцаў і казацка-татарскія лёгкія харугвы ўводзіўся падзел на больш цяжкую нацыянальную кавалерыю (НК) і больш лёгкую пярэднюю варту (ПВ). Камплектаванне новых падраздзяленняў ажыццяўлялася пераважна за кошт раней існуючых. Так, 1-я брыгада НК камплектавалася ў асноўным за кошт гусарскіх харугваў, таму захавала нефармальную назву гусарскай. 2-я брыгада НК была заснавана на базе харугваў пяцігорцаў, таму яшчэ доўга называлася пяцігорскай. Палкі пярэдняй варты, у сваю чаргу, афармляліся на базе татарскіх і казацкіх харугваў і пазней атрымалі неафіцыйную назву ўланскіх палкоў.

Драгунскія палкі скарачаліся. Толькі лейб-рэгімент драгунаў каралеўскіх ВКЛ пераўтвараўся ў полк карабінераў гвардыі коннай, астатнія тры драгунскія палкі спешываліся і пераўтвараліся ў пяхотныя [22, с. 403].

Нягледзячы на звыклы для дзяржаўнага бюджэту Рэчы Паспалітай недахоп сродкаў, на фінансаванне арміі ВКЛ рашэннем сойма было выдаткавана 6 596 тыс. злотых (зл.) [22, с. 402–403]. Але, як паказаў час, увасобіць рашэнні сойму ў жыццё і на гэты раз аказалася справай надзвычай цяжкай. У 1776 г., у сувязі з недахопам фінансавання, вайсковы бюджэт быў скарочаны больш чым напалову – да 2,3 млн. зл. [23, с. 565, 568]. У выніку гэтага запланаваная колькасць арміі ВКЛ у 8 тыс. чалавек дасягнута не была, і ў другой палове 70-х гг. армія ВКЛ налічвала ўсяго 4770 ваяроў.

9 снежня 1776 г. быў складзены кампут войска ВКЛ, які дае выдатную інфармацыю аб структуры арміі і яе фінансаванні, а таксама аб іерархіі ваенных чыноў адпаведна іх пазіцыі ў спісе і заробку, які яны атрымлівалі [24]. Кавалерыя Вялікага княства налічвала 2670 коней і складалася з палка гвардыі коннай, 2 брыгад НК і 5 палкоў ПВ. Абедзьве брыгады НК налічвалі па 478 коней з фінансаваннем па 300 тыс. зл. на брыгаду. Кожная брыгада складалася з 4 швадронаў (эскадронаў), кожны з якіх уключаў у сябе па 4 харугвы. На чале брыгады знаходзіўся камендант, яго намеснікам выступаў віцэ-камендант. Пры штабе знаходзілася і медыцынская частка, а таксама ветэрынарная служба. Тактычнай адзінкай брыгады з'яўлялася харугва [24, арк. 16].

У адрозненне ад брыгад НК, у палках ПВ колькасць асабістага складу падраздзяленняў была рознай. Напрыклад, у 1-ым палку каралевіча налічвалася 374 чалавекі, 2-гі полк Булавы Вялікай і 3-ці полк Булавы Польнай налічвалі па 150 ваяроў, у 4-ым палку Панятоўскага службу выконвалі 327 жаўнераў, а самым шматлікім быў 5-ты полк генерала Беляка, які меў 395 шабель у сваім складзе [24, арк. 6]. Звычайна полк складаўся з 6 харугваў і штаба. У штаб палка ўваходзілі палкоўнік, маёр і 6 ратмістраў, якія, як і ў брыгадах НК, толькі фармальна камандавалі харугвамі, пераклаўшы гэты цяжар на паручнікаў [24, арк. 37, 41].

На жаль, рэформы аказаліся палавінчатымі. Зрабіўшы крокі ў бок павелічэння колькасці войска і яго структурнай мадыфікацыі, прынцып камплектавання кавалерыі заставаўся ранейшым – шляхам прывода таварышамі сваіх пахтаў. Ва ўмовах, калі вядучыя краіны Еўропы такія, як Францыя, Прусія, Расія, ужо перайшлі да рэкруцкага спосабу камплектавання арміі, гэта быў відавочны недахоп, які значна зніжаў абароназдольнасць краіны. Тым не менш, рэформа арміі ў 1775 г. з'яўлялася вельмі неабходнай для ВКЛ і ўсёй РП з'явай. У выніку асцярожных дзеянняў Вайсковай камісіі пачаліся станоўчыя зрухі ў пытанні арганізацыі ўзброеных сіл краіны. Армія ВКЛ стала паступова пераўтварацца з дэкаратыўнага элемента ў сапраўдны баявы інструмент дзяржавы. Рэформа 1775 г. стала важным падмуркам для далейшага развіцця ўзброеных сіл як у ВКЛ, так і Польшчы, якое адбывалася ў канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XVIII ст.

Чарговая ваенная рэформа, ажыццяўленне якой у 1789 г. было ініцыіравана рашэннямі "Вялікага сойму", хаця і ўнесла вялікі ўклад у развіццё вайсковай справы ў ВКЛ, але арганізацыйна нічога не змяніла. Галоўнай мэтай рэформы стала колькаснае павелічэнне арміі ВКЛ да 21145 чал., а канкрэтна кавалерыі – да 7028 чал. Колькасць жаўнераў у дзвюх

брыгадах НК мусіла вырасці да 3268 чал., у 5 палках ПВ – да 3060 чал., у рэгіменце гвардыі коннай – да 700 чал. [25, арк. 47].

Аднак указаныя фарміраванні не ўдалося сфарміраваць цалкам у сувязі з пачаткам інтэрвенцыі суседніх дзяржаў у Рэч Паспалітую, адмовай караля ад рэформ і другім падзелам польска-літоўскай дзяржавы. Паражэнне здаровых сіл грамадства прывяло да вяртання арміі ВКЛ да дарэформеннага становішча. Трэці падзел Рэчы Паспалітай, вынікам якога стала ліквідацыя яе больш жыццяздолнымі суседзямі, паклаў канец існаванню рэгулярнай арміі Вялікага княства, але, як аказалася, ненадоўга. Праз 17 гадоў яна нечакана адрадзілася з попелу.

22 чэрвеня 1812 г. французскі імператар Напалеон выдаў адозву, у якой ён абвясціў аб пачатку “другой польскай вайны”, што не магло пакінуць шляхту беларуска-літоўскіх губерній абыякавай [26, с. 14]. 1 ліпеня 1812 г. была створана Камісія часовага ўрада ВКЛ, фактычна пачаўся працэс аднаўлення да гэтага часу ўжо моцна паланізаванай літоўска-беларускай дзяржаўнасці. Як у выпадку з Варшаўскім княствам, у склад ВКЛ пераважна ўвайшлі тэрыторыі, захопленыя Расіяй падчас другога і трэцяга падзелаў Рэчы Паспалітай. Камісія часовага ўрада станавілася вышэйшым органам цывільнага дзяржаўнага кіравання і складалася з 7 камітэтаў, адным з якіх з’яўляўся Ваенны камітэт.

5 ліпеня 1812 г. было абвешчана аб стварэнні 3-га Літоўскага палка уланаў Імператарскай гвардыі [27, с. 481]. Полк камплектаваўся валанцёрамі шляхецкага паходжання, а таксама студэнтамі Віленскага ўніверсітэта, ён павінен быў складацца з 5 эскадронаў па 2 роты ў кожным і налічваць 1280 чалавек. У полк залічваліся мужчыны ва ўзросце ад 18 да 40 гадоў, якія маглі экіпіравацца за ўласны кошт. Да лістапада 1812 г. былі сфарміраваны 4 эскадроны.

Каля 10 ліпеня было вырашана стварыць армію ВКЛ у складзе 5 пяхотных і 4 кавалерыйскіх палкоў, агульнай колькасцю 14304 чал. [27, с. 480, 498–499], [28], [29]. Галоўнай мэтай гэтага войска з’яўлялася ахова шляхоў камунікацый на тэрыторыі дэпартаментаў ВКЛ ад рэйдаў расійскай арміі. Камплектацыя палкоў ВКЛ адрознівалася ад падраздзяленняў Варшаўскага княства. Кавалерыйскі полк мусіў складацца з 4 эскадронаў па 2 роты кожным і налічваць 981 жаўнера, з іх 42 афіцэры, 939 падафіцэраў і шараговых.

Палкі арміі ВКЛ атрымалі нумары, якія працягвалі нумарацыю падраздзяленняў узброеных сіл Варшаўскага княства, у кавалерыі – з 17 па 20. Пры гэтым войска ВКЛ не з’яўлялася часткаю польскай арміі. Па лініі ваеннага кіравання армія ВКЛ падпарадкоўвалася свайму штабу, а праз яго – Галоўнаму штабу “Вялікай арміі”. Выключэнне складаў 3-ці легкаконны полк Я. Канопкі, які арганізацыйна ўваходзіў у склад гвардзейскіх падраздзяленняў французскай арміі. У канцы жніўня паўстала генеральная інспекцыя арміі ВКЛ.

На пачатку жніўня французская адміністрацыя, улічваючы патрыятычны ўздым у ВКЛ, прапанавала імператару павялічыць ваенныя сілы ВКЛ за кошт фарміравання дабраахвотных падраздзяленняў. За свой кошт пачаў фарміраванне кавалерыйскага палка Ігнат Манюшка, які атрымаў назву 21-шы полк конных стралкоў. Рэальна 21-шы полк пачаў фарміравацца толькі ў кастрычніку, таму ўкамплектавацца цалкам ён не меў магчымасці. Быў сфарміраваны толькі 1 эскадрон, які налічваў 10 афіцэраў і 258 падафіцэраў і шарагоўцаў [17, с. 563]. У Расіенскім павеце пачаў арганізацыю кавалерыйскага палка Ю. Гедрайц. У Пінскім павеце падобную спробу зрабіў Г. Яленскі [27, с. 561]. У верасні пачаў фарміраванне гусарскага палка М. Абрамовіч, але з прычыны недахопу грошай сабраных жаўнераў далучылі да палка конных стралкоў.

У баку ад грамадска-палітычных падзей на Беларусі не засталося і мясцовае татарскае насельніцтва. Арганізатарам татарскіх узброеных фарміраванняў стаў былы падпалкоўнік 4-га палка пярэдняй варты ВКЛ М.М. Ахматовіч [27, с. 559], [30]. У Навагрудскі, Ашмянскі, Лідскі, Ковенскі, Мінскі паветы, дзе пражывала татарскае насельніцтва, былі разасланы афіцэры, аднак сфарміраваць паспелі толькі адзін эскадрон, які ў якасці выведкі быў далучаны да 3 легкаконнага палка Я. Канопкі.

З паражэннем Францыі ў г. зв. напалеонаўскіх войнах спадзяванні на адраджэнне ў бліжэйшай перспектыве дзяржаўнасці ў форме ВКЛ зніклі, а наступныя спробы ў 1830–1831 і 1863 гг. аказаліся няўдалымі. Таму гісторыя айчыннай вайсковасці менавіта ў форме арміі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ВКЛ скончылася, пачаўся наступны этап, які характарызуецца службай выхадцаў з Беларусі, у залежнасці ад іх светапогляду, у войску Расійскай імперыі або, да пэўнага часу, Царства Польскага. Коратка эвалюцыю айчыннай кавалерыі ў XVIII – пачатку XIX ст. можна прадставіць у выглядзе табліцы 1.

Табліца 1 – Эвалюцыя айчыннай кавалерыі ў XVIII – пачатку XIX стст.

| **1717 г.** | **1775 г.** | **1812 г.** |
|---|---|---|
| 6 гусарскіх харугваў | 1 (гусарская) брыгада Нацыянальнай кавалерыі | 3 літоўскі полк уланаў Імператарскай гвардыі |
| 25 пяцігорскіх харугваў | 2 (пяцігорская) брыгада Нацыянальнай кавалерыі | 17 уланскі полк |
| 12 татарскіх харугваў | 1 полк пярэдняй варты караля | 18 уланскі полк |
| 8 казацкіх харугваў | 2 полк пярэдняй варты Булавы Вялікай | 19 уланскі полк |
| лейб-рэгімент драгунаў ВКЛ | 3 полк пярэдняй варты Булавы Польнай | 20 уланскі полк |
| рэгімент конны каралевіча | 4 полк пярэдняй варты | 21 полк конных стральцоў |
| рэгімент конны Булавы Вялікай | 5 полк пярэдняй варты | уланскі эскадрон татараў |
| рэгімент конны Булавы Польнай | рэгімент гвардыі коннай карабінераў ВКЛ | |

Нягледзячы на аб’ектыўныя складанасці ў рэфармаванні ваеннай справы ў апошняе стагоддзе існавання польска-літоўскай дзяржавы, у перыяд праўлення Аўгуста II Моцнага і Станіслава Панятоўскага былі зроблены дзейсныя меры па рэарганізацыі арміі ВКЛ і, у прыватнасці, кавалерыі. Арыентуючыся першапачаткова на саксонскія, а затым прускія ўзоры, былі ліквідаваны многія архаічныя рысы, а кавалерыя беларуска-літоўскай дзяржавы да канца XVIII ст. была прыведзена ў адпаведнасць з ваеннымі запытамі той эпохі. Толькі здрадніцкая палітыка часткі палітычнай эліты Рэчы Паспалітай у спалучэнні з інтэрвенцыяй суседніх дзяржаў перашкодзіла арміі ВКЛ стаць сур’ёзнай сілай, якая б магла выконваць сваю асноўную функцыю – забеспячэнне незалежнасці сваёй дзяржавы. Таму няма нічога дзіўнага, што праз 17 гадоў пасля знішчэння Рэчы Паспалітай армія ВКЛ, і перш за ўсё – кавалерыя, нібы паўстала з попелу, адрадзілася літаральна за некалькі месяцаў, арыентуючыся ў гэты раз на дасягненні ў ваеннай справе французаў.

**Літаратура**

1. Грыгор’еў, М. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касцюшкі (1765–1794) / М. Грыгор’еў. – Мінск, 1994. – 168 с.

2. Гужалоўскі, А. Войска ВКЛ: апошнія старонкі гісторыі / А. Гужалоўскі // Бел. гіст. часопіс. – 1994. – № 1. – С. 48–52.

3. Чаропка, С.А. Войска ВКЛ у святле ваеннай рэформы 1717 г./ С.А. Чаропка // Науч. Труды Респ. инстит. высш. школы : сб. науч. статей; в 2 ч. Ч. 1; редкол. : В.Ф. Берков (отв. ред.) [и др.]. – Минск: РИВШ, 2012. – С. 336–343.

4. Чаропка, С.А. Ваенная рэформа ў Вялікім княстве Літоўскім 1764–1766 гг. / С.А. Чаропка // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны : зб. навук. артыкулаў; вып. 1.; рэдкал. : Р.Р. Лазько [і інш.]. – Гомель : УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”, 2012. – С. 25–30.

5. Górski, K. Historya jazdy polskiej / K. Górski. – Kraków : nakładem księgarni polskiej spółki wzdawnicyej, 1894. – 366 s.

6. Nowak, T.M. Historia oręża Polskiego 963–1795 / T.M. Nowak, J. Wimmer. – Warszawa : Wiedza powszechna, 1981. – 700 s.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

7. Nowak, T. Dzieje oręża Polskiego do roku 1793 / T. Nowak, J. Wimmer : w 3 t. T. 1. – Warszawa : MON, 1968. – 418 s.
8. Rostafiński, N. Zarys historii rozwoju wojskowości w Polsce (992–1792) / N. Rostafiński. – Poznań : Nakł. księgarni Fr. Gutowskiego, 1922. – 164 s.
9. Historia wojskowości polskiej. – Warszawa : MON, 1972. – 871 s.
10. Wimmer, J. Historia piechoty polskiej do roku 1864 / J. Wimmer. – Warszawa : MON, 1978. – 615 s.
11. Górski, K. Historya piechoty polskiej / K. Górski. – Kraków : nakładem księgarni polskiej spółki wzdawnicyej, 1893. – 274 s.
12. Kukiel, M. Zarys historii wojskowości w Polsce / M. Kukiel. – Kraków : nakładem Krakowskiej spółki wzdawnicyej, 1929. – 356 s.
13. Müller, R. Die Armee Augusts des Starken. Das sächsische Heer von 1730 bis 1733 / R. Müller. – Berlin : Militärverlag der DDR, 1984. – 116 s.
14. Jany, C. Geschichte der königlich preussischen Armee / C. Jany. – Berlin, 1928. – 320 s.
15. Twardowski, B. Wojsko polskie Kościuszki w roku 1794 / B. Twardowski. – Poznań : Nakł. Księgarni katolickiej, 1894. – 90 s.
16. Mała Encyklopedia Wojskowa / red. Józef Urbanowicz. – Warszawa : Wydawnictwo Ministerstwa Obrony Narodowej, 1970.
17. Volumina Legum / J. Ohryzki, 1860. – 340 s.
18. Gembarzewski, B. Rodowody pułków polskich i oddziłów równorzędnych od r. 1717 do r. 1831 / B. Gembarzewski. – Warszawa : nakładem tow. wiedzy wojskowej, 1925. – 100 s.
19. Konfederacya Generalna omnium Ordinum Regni et Magni Ducatum Luthuaniae na konwokacyi Głowney Warszawskiey uchwalona // Volumina Legum. – Petersburg : nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VII. – S. 7–55.
20. Konstytucye Seymu walnego koronacyi krola IMCI 1764 r. // Volumina Legum. – Petersburg : nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VII. – S. 138–169.
21. Kukiel, M. Zarys historji wojskowości w Polsce / M. Kukiel. – Kraków : nakładem Krakowskiej spółki wzdawnicyej, 1929. – 356 s.
22. Konstytucye Wielkiego Xięstwa Litowskiego 1775 r. // Volumina Legum. – Petersburg : nakł. i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S. 389–590.
23. Konstytucye Wielkiego Xięstwa Litowskiego 1776 r. // Volumina Legum. – Petersburg : nakł. i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S. 564–574.
24. Biblioteka Czartoryskich (BCz.). – Rękopis 2555 IV. – Komput y płaca woyska WXL. – 84 s.
25. BCz. – Rękopis 1706 IV. – Etet tymczasowywoyska WXL r. 1789. – 35 s.
26. Staszewski, J. Generał Dominik Dziewanowski / J. Staszewski. – Poznan : członkami druk. wydaw. w Kaliszu, 1933. – 80 s.
27. Nawrot, D. Litwa i Napoleon w 1812 roku / D. Nawrot. – Katowice : wyd. Uniwersitetu Slanskiego, 2008. – 790 s.
28. Кудряшов, И.Ю. Вооруженные силы Литовского княжества 1812 года / И.Ю. Кудряшов. – М., 1991. – 19 с.
29. Gaidis, H.L. Napoleon's Lithuanian forces / H.L. Gaidis // Lithuanian quarterly journal of arts and sciences [Electronic resource]. – 1984. – Vol. 30, № 1. – Mode of access : http://www.lituanus.org/1984_1/84_1_01.htm. – Date of access : 15.12.2012.
30. Шереметьев, О.В. Литовские татары в составе Императорской гвардии Наполеона / О.В. Шереметьев [Электронный ресурс]. – Режим доступа : www.august-1914.ru/sheremetev.pdf. – Дата доступа : 18.12.2012.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 01.04.13

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ